**Т. М. ІГНАЦЮК**
Брэст, БрДТУ

# ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНА-ІМЕННАЯ ДЫСКУРСІЯ І ІНСТАНЦЫЯ СЛОВА

Паняцце *інстытут* у сучасных дыскурсах з'яўляецца надзвычай распаўсюджаным. Матываваныя ім выразы прысутнічаюць там, дзе прадметам маўлення выступаюць пэўныя сацыяльныя факты і падзеі. У інстытуцыянальную сферу ўваходзіць палітыка, масавая і элітарная культура, ідэалогія, эканоміка, фінансавая справа, рэлігія, права, навука і інш. Тыя сферы, дзе назіраецца пад'ём і адбываецца развіццё, не абыходзяцца без інстытуцыянальнасці як фундаментальнай катэгорыі дзейнасці.

Тэрмін *інстытут* выкарыстоўваецца ў канстытуцыйным праве: *інстытут парламента*, *урад як інстытут улады* і інш. Роднаснымі яму з'яўляюцца тэрміны, што ўзніклі ў розных дыскурсах нядаўна, але ўжо зафіксаваны слоўнікамі: *інстытуцыяналізм*, *інстытуцыяналістыка*, *інстытуцыя*, *інстытуцыяналізацыя*.

Выкарыстанне інстытуцыянальнай тэрміналогіі звязана з існаваннем усякага роду стандартаў – замацаваннем і афармленнем розных сацыяльных сувязей: *інстытут сям'і*, *інстытут навучання*, *дзяржаўныя*

*інстытуты* і інш. Пад інстытутамі разумеюцца пэўныя арганізацыйныя структуры, у якіх адбываецца сацыяльная дзейнасць: *эканамічныя інстытуты*, *палітычныя інстытуты*, *выхаваўчыя інстытуты* і інш. Валентныя сувязі тэрміна *інстытут* у мове дастаткова разнастайныя: *інстытут улады*, *інстытут прыватнай уласнасці*, *інстытут роднасці*, *інстытут шлюбу*, *інстытут звычая*, *інстытут права* і г. д.

Паняцце інстытута паходзіць з лацінскага слова *institutum* 'ўстанаўленне, звычай' і азначае тую ці іншую форму грамадскай арганізацыі. У абстрактным сэнсе пад інстытутам разумеецца спосаб арганізацыі сумеснай дзейнасці людзей. Напрыклад, прыродным стыхіям, а таксама масавым рухам інстытуцыянальнасць не ўласціва. Пра наяўнасць дадзенай уласцівасці можна казаць тады, калі адзначаецца факт праяўлення пэўнага арганізацыйнага моманту. Напрыклад, мафія – *арганізаваны* інстытут злачынцаў. Розныя зборныя сукупнасці адзначанай уласцівасцю не валодаюць: *матрасня*, *звяр'ё*, *афіцар'ё* і да т. п.

Інстытуцыяналізацыя – працэс арганізацыі сацыяльнай рэальнасці, пераход ад неарганізавана-стыхійнай дзейнасці да ўстанаўлення арганізацыйных структур з іерархіяй улады, рэгламентацыі працы, юрыдычнай легалізацыі і г. д. Інстытуцыяналізацыя таксама разумецца як паняцце прыватнай практыкі да ўзроўню грамадскага інстытута. Такі пад'ём адбываецца разам з заканадаўчым афармленнем статусу і ўзнікненнем адпаведнай арганізацыйнай інфраструктуры. Тэрмін *інстытуцыяналізацыя* актыўна выкарыстоўваецца ў паліталогіі. Так, сцвярджаецца факт інстытуцыяналізацыі норм, працэдур, арганізацый, палітычных партый і партыйных сістэм, а таксама тых ці іншых палітычных практык.

Тэрміну *інстытуцыяналізм* адпавядаюць два паняцці – *інстытуцыя* і *інстытут*. Яны суадносяцца з двума ўзроўнямі інстытуцыяналізацыі. Адрозненне паняццяў *інстытут* і *інстытуцыя* даволі ўмоўнае. У канцэпцыях інстытуцыяналістаў яны маюць невыразны і размыты змест. Аналіз адпаведнай літаратуры па інстытуцыяналістыцы наводзіць на думку аб мэтазгоднасці, суадносіць іх з двума ўзроўнямі інстытуцыяналізацыі: эмпірычна-фактычным і тэарэтычным (інакш спекулятыўным).

На першым узроўні інстытуцыяналізацыя адбываецца з дапамогай нефармальнай (класічнай) інстытуцыі – *звычаю*. Гэта ўзровень рэгіянальны (краёвы): *Што край, то і звычай*. Звычаю адпавядае тое, што адбываецца звычайна – звычайнае. Так, калі нехта вымаўляе *"Мне, як звычайна"*, то з пэўнасцю можна сказаць, што ў дадзены момант яго дзейнасць падпарадкавана звычаю. Паводзіны асобы рэгламентаваны сукупнасцю звычаяў, якія бытуюць у тых ці іншых соцыумах. На звычай указваюць звароты *"Як водзіцца"*, *"Як павялося"*. Тое, што падпарадкоўваецца звычаю, складаючы "класіку жанра", з'яўляецца інстытуцыяй. Звычайная

культурная інстытуцыя – *клуб*. Так, у сельскім клубе звычайна па вечарах збіраецца моладзь, у спартыўных клубах рыхтуюцца будучыя спартсмены.

Звычай мае дачыненне да культуры паводзін асобы. Асоба прызнаецца за культурную, калі яе паводзіны абапіраюцца на звычаі, якія склаліся традыцыйна ў пэўным соцыуме.

Інстытуцыя для кожнага, хто ў ёй знаходзіцца, "свая". У ёй ажыццяўляецца прынцып "Кожнаму сваё". Дом як інстытуцыя – мой (*Мой дом – мая крэпасць*). Займеннік *мой* указвае на прыватнае *права*, якое не ўзнікае ў кожнага (параўн.: *Кожнаму сваё, а мне – маё*). У кожнага *свае* абавязкі. Момант інстытуцыяналізацыі мае гештальтны аспект. Звычайны здымак: асоба на фоне ўласнага дому. Фон мае на мэце адцяніць каларытнасць фігуранта, падкрэсліць яго асабовасць.

Інстытуцыі абапіраюцца на звычаі і традыцыі. Напрыклад, існуе класічная інстытуцыя бацькоўства (рус. *отечества*). Ва ўсходнеславянскіх мовах яна выражана ў формулах намінацыі – *чый*? (*Пятроў сын – Пятровіч, Іванаў сын – Іваноў* і г. д.); параўн.: *чыя зямля? – бацькава – бацькаўшчына (айчына)*. Класічныя інстытуты гарантуюць годнасць асобы (параўн. стар.-пол. *godność* – прозвішча). Годнасць асобы ўсведамляецца ў кантэксце годнасці бацькі, напр.: *Іван быў годны жаніх у вёсцы. Пра яго казалі: "гаспадароў сын"* (дыял.). Інстытуцыя паўстае як аспект ўзору паводзін чалавека ў грамадстве.

Паняцце інстытуцыянальнасці ўзнікае ў той момант, калі мы задаём пытанне *"Што гэта такое ...?"* Адказам на яго з'яўляецца пэўная канцэптуалізацыя з'явы, напр.: *Вартасць – эканамічная катэгорыя, якая...* і г. д. Аднак відавочна абмежаванаць такога роду пытанняў. Так, наўрад ці правамерна пытанне *"Што гэта?"* у адносінах да носа чалавека, дзюбы птушкі, лыча свінні і г. д. Аказваецца, што для чалавека важна не што гэта такое, а аспект яго называння: *як* называецца гэтая "дэталь" у розных істот. Частка выступае адзінкавасцю ў цэлым і ўспрымаецца неад'емна ад яго: нос – твар, язык – рот, пазногаць – палец і г. д. Назва дэскрыптыўная (даіменная) па сутнасці, ёй апісальна схопліваецца нейкая адзінкавасць у складзе цэлага. Намінацыя ж канцэптуалізуе з'яву ці катэгарызуе яе, адносячы да пэўнай катэгорыі.

Пытанне пра назву мае пазнавальны характар і не тычыцца існага – анталогіі прадмета (з'явы), скіраванай на яе разуменне. Пазнанне не залежыць ад існуючых інстытутаў (культурных звычаяў і законаў). У шэрагу выпадкаў узнікае пратэст супраць пастаноўкі пытання аб "таковасці": *Не пытайце, што яно такое. Спытайце, як гэта называецца.* Пытанне *"Што гэта такое?"* не падыходзіць да ўсяго, што "не што" (нешта), а неяк называецца.

Пазнавальнае "ўсё гэтае" парадаксальнае. У ім няма неабходнасці, аднак яно патрэбна ўсім. У яго шмат назваў-зоваў. Яны розныя ў залежнасці ад таго, дзе, хто і калі каго-што заве-называе. Яно мае *слоўны* характар – само нешта гаворыць. "Што", наадварот, артадаксальнае – правільнае (нармальнае) і чаканае. Яно безназоўнае, але падлягае намінаванню. Будучы існым, але не названым, яно падводзіцца пад агульную катэгорыю закона. Такім законам у мове з'яўляецца інстытут імені (nomina). Як абранае, яно правільна размяркоўваецца сярод такіх жа абраных, хто да яго прычынены ці мае ў ім долю.

Статус інстытута мае любая *справа* (лац. *ургія*). У ёй праяўляецца імкненне да адзінага і адзінасці – *а д н а  справа*. Наадварот, *праца* выступае ў якасці інстытуцыі. Праца не адна – яе *шмат* і яна, у адрозненні ад справы, па сутнасці, ніколі не канчаецца. На справу (дзела) *ідуць*, а да працы *ходзяць*. Са справай спраўляюцца, яна ўдаецца. Праца выконваецца, у ёй шчасціць. Ад справы – плады, за працу – узнагарода.

Інстытуцыяльнае адзінае прадстае як *роднае* – аднаго роду, аднароднае. *Жанчыне вялікае шчасце – **адзінага** ў свеце любіць* (Я. Янішчыц). Роднасць і іншароднасць (варожасць) – класічныя маўленчыя інстытуцыі. Ім супрацьстаіць інстанцыя "ўсяго свайго", якая стварае антытэзу інстытуту роднасці. Першая ступень гэтай інстанцыі – блізкасць (*блізкі для мяне чалавек*), другая – сваяцтва (*свой чалавек*). У антыноміі каханне – міласць інстанцыяй выступае апошняя. Міласць не ахвярная – яна прыносіцца, але выяўляецца альбо падаецца. Напрыклад, адна з невербальных выяў міласці – *"мілая твая ўсмешка"*.

Класічнай інстытуцыяй з'яўляецца *кроў*. Аб гэтым сведчыць сувязь дадзенага канцэпту з інстытутам грошай, напр., *кроўныя грошыкі*. У медыцынскім кантэксце крыві супрацьстаіць *лімфа* – бясколерная вадкасць, якая амывае ўсе клеткі цела. Гэтае кніжнае слова ў мове паўстае ў постаці *соку* (*сокі зямлі*, *сокі цаліны*) – вільгаці, якую не давяць, але *жмуць* для ўжывання, *смокчуць*, а не ссуць (параўн. пол. *ssaki* 'млекакормячыя'). Фразеалогія соку – *варыцца ў сваім саку*, *высмактаць усе сокі*, *у самым саку* і інш., але ідыяматыка крыві: *кроў з малаком*, *умыцца кроўю*, *кроў кіпіць* і да т. п.

Прыкметай інстытуцыяльнасці валодае як арганічнае, так і арганізацыйнае. Напрыклад, космас разумеецца як арганізаваная структура. Іншае яго імя – *мір* (параўн.: *мікрамір* і *макрамір*). Мір – гэта таксама сацыяльны інстытут, сельская грамада (*Што міру, тое і бабіну сыну*). Інстытуцыянальным статус мае тое, што адбываецца. "Мір не ёсць, мір адбываецца" (М. Мамардашвілі). Яму супрацьпастаўляецца ўсё, што *праходзіць* і з чым нельга нічога зрабіць (напр.: *Жыццё праходзіць)*. Інстанцыя жыцця стварае антытэзу інстытуцыі быту і інстытуту быцця.

Істотнай прыкметай інстуцыянальнага з'яўляецца яго *пераходнасць* (транзітыўнасць). Напрыклад, у інстытуцыянальным дыскурсе – гэта пераход ад аднаго прадмета да другога. Наадварот, інстанцыя прадугледжвае *праходжанне*. Так, індывід у жыцці *праходзіць* усе ступені росту – шлях ад хлопчыка да мужчыны, параўн.: *прайсці агонь, ваду і медныя трубы*.

Інстытуты звязваюцца з уяўленнем пра рух і, адпаведна, пэўны кірунак. Так, у педінстытуце адбываецца развіццё асобы ў педагагічным кірунку, у медінстытуце – у медыцынскім і г. д. Наадварот, у інстанцыі *акадэміі* адсутнічае паняцце кірунку, як і руху наогул. Увасабленне парадокса "Хто ходзіць, той не рухаецца" ажыцяўлялася ў старажытных акадэміях з усёй відавочнасцю. Вучні хадзілі следам за настаўнікам, імкнучыся не прапусціць ніводнага слова, каб улавіць сутнасць яго гаворкі. Настаўнік нікога не вучыў – вучні самі вучыліся у яго. Пераймалі яго вопыт, наследавалі яго звычкі – яны *праходзілі* яго школу, нікуды пры гэтым не пераходзячы. Па іманентнай акадэмічнай мадэлі да гэтага часу ажыццяўляецца навучанне ў інстанцыі гуртка (напр., гурток "Умелыя рукі", навуковы гурток і др.). Іманентная мадэль – "хадзіць па крузе", не выходзячы з яго – падставовая мадэль усяго, што не адбываецца як дзеянне, але ажыццяўляецца – расце і шырыцца. Рух жа знамянуе пераход ў трансцэдэнтную сферу align="left"рознага роду ўстанаўленняў: інстытуцый і інстытутаў. Прагрэсіўнаму ці рэгрэсіўнаму руху, якому па азначэнні ўласцівы напрамак, супрацьстаіць стан з яго неад'емным *вектарам* росту.

Інстанцыяй можна назваць месца (топас), дзе нічога не адбываецца. Усё, што не адбываеццца, парадаксальна *ёсць*. Інстытуцыя не мае ўласнага статусу, аднак у яе ёсць свой *пост*. Сутнасць паста (калі нават не разглядаць гэтае слова ў святле рэлігіі) заключаецца ва ўстрыманні. Гэта месца, якое нешта ўтрымлівае, за што нехта трымаецца. Яно ставіць абарону і блок (гл. *блок-пост*). У гэтым сэнсе кожнае месца, дзе каго-што трымаюць, з пэўнасцю можа быць названа пастом (топасам) таго, хто трымаецца ці знаходзіцца на "пастоі". Так, *курнік* ёсць пост для кур, *кароўнік* – для кароў, *свінарнік* – для свіней і г. д. Пад словам *пост* маецца на ўвазе пэўны локас – аспект лакалізацыі, якая распазнаецца па *вектары* "для каго-чаго".

Такім чынам, можна казаць, што з антытэзай інстанцый і інстытутаў мы сустракаемся на кожным кроку ў штодзённасці і быце. Інстытуцыянальныя пытанні задаюцца прама: *Хто ён такі? Хто ты такі! Хто ты?* да т. п. Такога роду пытанні пры адпаведных структурных зменах пераходзяць у "клічы" і нараканні, параўн.: *А хто ён такі, каб мною распараджацца! Ты хто такі!* Наадварот, інстанцыйны запыт гучыць не прама, а "абыходна": *Як цябе завуць? Як мне цябе называць? Як гэта называецца?* У ім выказваецца дысцыплінарна-этычны аспект, напр.: *Абяцаў-бажыўся і не выканаў сваё абяцанне. Як гэта называецца?*

Таксама трэба зазначыць, што антытэза інстанцыі і інстытута аказваецца жыццёва важнай. Напрыклад, у чалавека, акрамя *органаў* як арганічных інстытуцый, ёсць інстанцыі – не-органы. Класічны орган і разам з тым вялікі сімвал культуры – сэрца. Душа ж не мае арганічнай прыроды. Дзеля незразумелай і загадкавай інстанцыі, названай душой, створана ўсё мастацтва – *песні для душы, вершы для душы* і г. д. Усё, што *праходзіць* праз душу, не тоесная таму, што *адбываецца* ў сэрцы. Сэрца – арэна барацьбы, душа – сцэна жыцця. Сэрца адкрываецца (расчыняецца) як дзверы дома не ўсім, душа *расхінаецца* насустрач кожнаму, хто для яе блізкі. І было б “глухім” пытанне *“Што такое душа?”*. Карэктнае пытанне: *Як называецца субстанцыя, якая баліць, плача?*